■ Асабістая гісторыя

# «РАЮ ЎСІМ ЖАНЧЫНАМ ПЕРАСТАЦЬ БАЯЦЦА І ЗАГАВАРЫЦЬ»

«З мужам пражыла ў шлюбе амаль 20 гадоў, — з дрыготкай у голасе ўспамінае Настасся (імя зменена), якая разам з 12-гадовым сынам хавалася ў прытулку для пацярпелых ад хатняга гвалту каля 2 месяцаў. — Калі пачалі жыць разам, адразу з'явіліся вар'яцкія праявы. Проста, калі чалавека кахаеш, на многае заплюшчваеш вочы. Ён стаў прыходзіць дадому нецвярозым. Калі выпіваў, то рабіўся неадэкватным: замыкаў кватэру, забіраў ключы і тэлефоны. Ужо з першых гадоў шлюбу ён стаў мяне біць. Спачатку ўсё абыходзілася сінякамі, потым пайшлі сур'ёзныя пераломы. Ён пускаў мяне толькі на працу і на дзесяць хвілін у краму, заўсёды дасканала правяраў чэкі, кантраляваў мой заробак да апошняй капейкі, некалькі разоў замахваўся на сыночка. Гэта цягнулася гадамі...

Я жывіла сябе ілюзіямі, што муж зменіцца, жыла па прынцыпе «Б'е — значыць кахае». Калі з'явілася дзіця, я пачала задумвацца, з каго яно будзе браць прыклад. Памятаю, як малы вельмі спужаўся, калі я не магла спыніць кроў. Раней сын заікаўся, потым я яго вылечыла. Мне не было куды ўцячы: родных няма, сяброўак таксама за ўсе гады не засталося. Наогул мне было сорамна камусьці расказаць пра свае праблемы, бо людзі, якія не траплялі ў падобную сітуацыю, мяне проста не разумелі.

Шмат разоў звярталася ў міліцыю. Каб прынялі заяву, я павінна была «зняць пабоі», аднак муж не выпускаў мяне з кватэры. Некалькі разоў яго забіралі, адзін раз ён збягаў да прыезду міліцыі. Тады я набралася сіл і пайшла ў сацдапамогу па месцы жыхарства, там мне і падказалі нумар «гарачай лініі». Апошні раз, калі муж напіўся і пачаў буяніць, я паспела яго набраць, дзяўчына на тым канцы провада выклікала міліцыю. У той вечар я апынулася ў прытулку».

Прытулак на базе МГА «Гендарныя перспектывы» адкрыўся ў чэрвені 2014 года ў рамках сумеснага праекта з Аўстрыяй. Ён месціцца ў прасторнай двухпакаёвай кватэры ў адным са спальных раёнаў Мінска. З мэтай бяспекі яе адрас не распаўсюджваецца, а сустрэчы са спецыялістамі з розных арганізацый праходзяць на нейтральнай тэрыторыі. Кватэра разлічана на дзве сям'і. Тэрмін пражывання можа расцягнуцца больш чым на тры месяцы.

**Іна САЛЕНІКОВІЧ, псіхолаг МГА «Гендарныя перспектывы»:** *«У нашых жанчын вельмі шмат страхаў: страшна пайсці да псіхатэрапеўта, страшна быць адной, страшна застацца без фінансавай дапамогі. Акрамя гэтага, псіхалогія агрэсара ў тым, што ён заўсёды вінавацiць ахвяру. Кліенткі пачынаюць капацца ў сабе і ва ўсім сябе вінаваціць. У працы з пацярпелымі ад хатняга гвалту ўвага звяртаецца на падняцце самаацэнкі, усведамленне ўласнай каштоўнасці і веру ў свае сілы. Змяніць агрэсара немагчыма. Можна змяніць сітуацыю пры доўгай і глыбокай працы над адносінамі абаіх партнёраў. Абое павінны пайсці да спецыяліста: агрэсар — каб навучыцца пераадольваць гнеў, ахвяра — каб пазбавіцца ад сузалежнасці. Потым пажадана прайсці сямейную тэрапію».*

Настасся з сынам апынулася ў «крызісным пакоі» ў ліпені мінулага года. У яе не было сродкаў для існавання і нагадвалі пра сябе праблемы са здароўем. Акрамя гэтага, муж спрабаваў знайсці «прапажу» і вярнуць у «зняволенне». «У прытулку мяне забяспечылі прадуктамі харчавання, аплацілі дарогу і лекі, дапамаглі зафіксаваць пабоі і аформіць заяву, падключылі юрыстаў і адвакатаў, аказалі псіхалагічную і медыцынскую дапамогу», — кажа Настасся.

**«Ён пускаў мяне толькі на працу і на дзесяць хвілін у краму, заўсёды дасканала правяраў чэкі, кантраляваў мой заробак да апошняй капейкі, некалькі разоў замахваўся на сыночка. Гэта цягнулася гадамі...»**

За два гады паслугамі прытулку скарысталіся 39 жанчын і 45 дзяцей. «На жаль, праект, у рамках якога «сховішча» было адкрыта, завяршаецца, — дзеліцца **кіраўніца прытулку для пацярпелых ад хатняга гвалту МГА «Гендарныя перспектывы» Наталля БУБЛЕЙ.** — Цяпер шукаем новую крыніцу, якая здолее фінансаваць прытулак. Арэнда памяшкання, камунальныя паслугі, аплата прадуктаў і кансультацыі спецыялістаў — усё гэта вялікія грошы, якія не надта проста знайсці».

**Сёння ў Беларусі каля 110 «крызісных пакояў». Дзейнічаюць яны пры тэрытарыяльных цэнтрах сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. Як альтэрнатыва дзяржаўным маюцца прытулкі няўрадавых арганізацый** (тры — у Мінску, па адным — у Лідзе і Магілёве).

У Настассі жыццё паступова ідзе на лад. Жанчына працуе і самастойна здымае жыллё, яна стала ўпэўненай у сабе. «Я цяпер адчуваю сябе значна лепей, — прызнаецца Насця. — Муж працягвае за мной хадзіць, аднак не падыходзіць блізка: зараз ідзе судовы працэс. Я раю ўсім жанчынам, якія пакутуюць ад падобных праблем, перастаць баяцца і загаварыць. Калі б не звярнулася па дапамогу, я не ведаю, чым бы гэта скончылася для мяне і майго дзіцяці».

**Агульнанацыянальная «гарачая лінія» для пацярпелых ад хатняга гвалту: 8 801 100-88-01 (штодзённа з 08.00 да 20.00).**

**Вераніка УЛАСЕВІЧ.** *veronika.ulasevich@mail.ru*

■



Фота носіць ілюстрацыйны характар.

■ Выйсце ёсць

# «АДКАЗНАСЦЬ ЗАЎСЁДЫ НА ТЫМ, ХТО Б'Е»

## Псіхолагам трэба працаваць не толькі з ахвярамі

**«Нашы кліенты — і рознарабочыя, і міліцыянеры, і дыпламаты, і артысты». З 2014 года ў Мінскім гарадскім цэнтры сацыяльнага абслугоўвання сям'і і дзяцей праводзяць кансультацыі для мужчын, якія прымяняюць гвалт. За гэты час па псіхалагічную дапамогу звярнулася больш за 60 агрэсараў. У маштабах краіны (дый нават сталіцы) лічба зусім невялікая: па статыстыцы кожная трэцяя беларуска падвяргалася хатняму гвалту. Але, магчыма, у гэтых больш чым паўсотні сем'ях жыццё нарэшце зменіцца да лепшага.**

**Чаму агрэсары самі вырашаюць прыйсці да псіхолага? Наколькі эфектыўная карэкцыйная праграма? І ці ёсць гарантыя, што мужчына пасля праходжання тэрапіі больш ніколі не падыме руку на жонку?**

### На тэрапію прыходзяць па сваім жаданні

У аснове карэкцыйнай праграмы для мужчын-агрэсараў — Дулуцкая мадэль, якая ўжо больш за 30 гадоў паспяхова працуе па ўсім свеце. Яе прымяняюць у ЗША, Вялікабрытаніі, скандынаўскіх краінах, Польшчы, Украіне.

— Асноўная ідэя — гэта тое, што гвалт — засвоеныя паводзіны, — тлумачыць **псіхолаг Мінскага гарадскога цэнтра сацабслугоўвання сям'і і дзяцей Раман КРУЧКОЎ,** які займаўся адаптацыяй амерыканскай мадэлі для прымянення ў Беларусі. — Мужчына так ці інакш усведамляе, што ён робіць, а значыць, мусіць прыняць на сябе адказнасць. Заўсёды адказнасць на тым, хто б'е, таму што ў любы момант ён мае магчымасць стрымацца.

Праграма цягнецца ад 6 да 8 месяцаў. Агрэсары штотыднёва бясплатна наведваюць індывідуальныя тэрапеўтычныя сеансы, ходзяць на групы. Як правіла, праз паўтара-два месяцы мужчыны адмаўляюцца ад фізічнага гвалту. Астатні час ідзе «шліфоўка»: чалавеку дапамагаюць разабрацца, што яму трэба змяніць у сабе, як наладзіць адносіны з партнёркай. Псіхолагі вучаць мужчын новым спосабам камунікацыі, паказваюць, як скідваць эмацыйнае напружанне, тлумачаць наступствы гвалту для ўсёй сям'і.

Складана ўявіць, каб агрэсары па сваім жаданні ішлі на тэрапію, але... Раман Кручкоў кажа, што мужчыны звяртаюцца тады, калі гвалт становіцца праблемай і для іх. Аказваюцца пад судом за абразу ці катаванне, жанчына сыходзіць, дзіця пачынае капіраваць іх паводзіны.

Часта сходзіць да псіхолага агрэсараў просяць жонкі. Ці самі звяртаюцца ў цэнтр абсалютна па іншай праблеме, а ў працэсе высвятляецца, што ў іх сям'і ёсць хатні гвалт.

— Для некаторых ахвяр гэта з'яўляецца адкрыццём, — заўважае спецыяліст. — Яны жывуць, цвёрда разумеючы, што такія паводзіны — норма, таму што, напрыклад, у іх уласных сем'ях было тое ж самае. А чалавек можа сістэматычна прыніжаць жанчыну, сарамціць, маніпуляваць, кантраляваць — гэта таксама формы гвалту.

### Агрэсар сам ахвяра гвалту

Чаму мужчыны прыбягаюць да гвалту? Матывацыя простая: я прымяняю сілу, калі хачу, каб ты перастала рабіць тое, што робіш, ці зрабіла тое, чаго не хочаш. А іншымі сродкамі не атрымліваецца. Часцей за ўсё агрэсары прызнаюцца, што перад уласна актам гвалту яны адчувалі бяссілле. І злосць, што не ўдаецца ніяк настаяць на сваім.

Фізічны гвалт выкарыстоўваюць часам для эмацыйнай разгрузкі.

— Калі, працуючы з такім чалавекам, капаць углыб, у большасці выпадкаў удаецца ўстанавіць, што ён сам — ахвяра гвалту, — прызнаецца Раман Кручкоў. — Напрыклад, у дзяцінстве яго абражалі, высмейвалі. Неабавязкова тата агрэсар. Мамы часта прыніжаюць: «На каго ты падобны!», «Свіння такая!». Усё гэта падрывае самаацэнку маленькага чалавека. Плюс да ўсяго дзеці, як губка, убіраюць стыль зносін паміж бацькамі. Калі ёсць дысфункцыянальная камунікацыя, малыя гэта счытваюць і потым паўтараюць, у гульнях напрыклад. Гвалтоўным паводзінам усё ж такі вучацца.

**Мужчыны звяртаюцца тады, калі гвалт становіцца праблемай і для іх. Аказваюцца пад судом за абразу ці катаванне, жанчына сыходзіць, дзіця пачынае капіраваць іх паводзіны.**

Калі мужчына ўжо аднойчы прымяніў сілу, пытанне не стаіць так: ці зробіць ён гэта яшчэ раз? Ён у прынцыпе здольны на гвалт і гэта паказаў. Многія пры гэтым адмаўляюць праблему.

— Вы пераходзілі дарогу на чырвоны? Не ідзяце ж адразу самі плаціць штраф? Вось і там тое ж самае. На глыбінным узроўні яны не лічаць, што робяць нешта няправільнае. Так, яна дурніца, крычала, і я ёй паказаў, хто ў доме гаспадар.

Тэрапія патрэбна не толькі агрэсарам. Іх жонкам, якія чамусьці застаюцца ў гэтых адносінах, таксама неабходна працаваць над сабой. З імі псіхолагі займаюцца асобна.

— Калі мужчына пачынае наведваць праграму, многія лічаць, што справа зроблена. Ён перастае біць, жанчына расслабляецца... і ўсё вяртаецца. Змены патрабуюць намаганняў і часу. І мяняцца павінны абое. Я не кажу, што жанчына нясе частку адказнасці за тое, што яе б'юць. Не. Але калі яна не зразумее, у якіх умовах жыве і як ёй трэба рабіць, каб не быць ахвярай гвалту, то не думаю, што яе становішча надта палепшыцца, — каментуе псіхолаг.

### Абавязалаўка павінна быць

Уласную статыстыку эфектыўнасці праграмы ў цэнтры пакуль не вядуць: выбарка не вельмі вялікая. Але замежны вопыт сведчыць: каля 75 працэнтаў мужчын пасля праходжання карэкцыі перастаюць прымяняць гвалт.

***— А што з астатнімі 25-ццю?***

— У нас няма мэты вылечыць усіх, хутчэй — даць магчымасць змяніцца. Мы не лічым гэта няўдачай. У нас дакладнае разуменне межаў. Мы робім тое, што неабходна тут, адказваем за гэта, а мужчына — за тое, што адбываецца дома. Калі, узброены ведамі, ён усё ж такі прымяняе гвалт, то гэта яго рашэнне, — кажа псіхолаг.

Раман Кручкоў быў на стажыроўцы ў Штатах на гэтай тэме, вывучаў, як працуе карэкцыйная праграма ў іх. У ЗША 30-40 працэнтаў агрэсараў прыходзяць на тэрапію па рашэнні суда, яшчэ 30 працэнтаў — тыя, хто не стаў чакаць, пакуль трапіць пад следства (яны звяртаюцца па рэкамендацыі сацыяльных службаў). Для амерыканцаў, дарэчы, праграма платная: адно наведванне каштуе каля 30-40 долараў.

Беларускіх мужчын прымусіць запісацца на тэрапію не могуць. У нас пакуль адсутнічае закон аб хатнім гвалце, які б, з аднаго боку, стаў моцнай матывацыяй для агрэсараў пайсці да псіхолага (бо дакладна прапісваў бы, што адносіцца да гвалту і якое за гэта пакаранне), з другога — дзейсным рычагом ціску.

— Гвалт сам па сабе не заканчваецца, яго трэба спыняць. За мяжой суддзя можа прымусова накіраваць чалавека на тэрапію. У нас я ездзіў па судах, расказваў да праграме, прапаноўваў рэкамендаваць яе мужчынам. Думаеце, хоць з аднаго прыйшоў агрэсар? Судзі спасылаюцца на тое, што няма адпаведнага дакумента... Ведаеце, хто накіроўвае? Загадчыца дзіцячага садка. Таму што ёсць 18-ы дэкрэт, па якім могуць адабраць дзяцей, і гэта баяцца.

Раман Кручкоў упэўнены: нейкая абавязалаўка ўсё ж такі павінна быць. Бо знойдуцца тыя, хто да апошняга будзе ўпірацца, што гвалт у сям'і — не праблема. А праца толькі з ахвярамі не дапаможа цалкам выправіць сітуацыю. «Мужчына-агрэсар, выхавае сына з такімі ж установкамі, а пасля гэты хлопчык вырасце і трапіць вашай дачцэ. Усё ўзаемазвязана».

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

■